Грыгаровіч Я.Д., рэктар
Беларускага універсітэта культуры

# СТРУКТУРНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ СІСТЭМЫ ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ АДУКАЦЫІ

Амаль 23 гады назад ЮНЕСКА пачала працу па доўгатэрміновай праграме фундаментальнага абнаўлення вышэйшай адукацыйнай сістэмы ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы, мэта якой - пераўтварыць універсітэты ў цэнтры бесперапыннай адукацыі, зрабіць іх каардынуючымі ўстановамі па ўсіх відах гуманітарнага прафесійнага навучання: падрыхтоўкі на розных ступенях вышэйшай адукацыі, перападрыхтоўкі пры змене прафесіі, удасканалення прафесійнага ўзроўню, пасляуніверсітэцкай адукацыі (аспірантура, дактарат і г.д.).

Такім чынам, універсітэт становіцца шматузроўневай адкрытай сістэмай, выступае ў якасці рэзервовага цэнтра для ўсей адукацыйнай сістэмы, забяспечваючы яе матэрыяламі, планамі, праграмамі, вынікамі навуковых даследаванняў, высокапрафесійнымі кадрамі.

На Беларусі, дзе сістэма вышэйшай адукацыі апошнія дзесяцігоддзі была ў значнай ступені "закрытай", ізаляванай ад іншых крыніц адукацыі, выкананне праграмы ЮНЕСКА мае асаблівае значэнне.

Выкарыстоўваць найвялікшы інтэлектуальны патэнцыял, сканцэнтраваны ў ВНУ, назапашаныя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, ствараць бесперапынную, пераемную, паслядоўную сістэму прафесійнай адукацыі для самарэалізацыі і самаўдасканалення асобы - задача найважнейшая.

Асноўнымі элементамі такой сістэмы для навучальных устаноў культуры могуць быць:

1) пачатковая мастацкая адукацыя: школы - музычная, харэаграфічная, мастацкая і інш., спецыяльныя школы з ухілам у адзін з відаў мастацтва ці культуры з тэрмінам навучання 5-7 год;

2) сярэднеспецыяльная прафесійная адукацыя (музычныя, харэаграфічныя, тэатральныя, мастацкія вучылішчы ці вучылішчы культуры; мастацкія, бібліятэчныя каледжы, ліцэі ці іншыя ўстановы) з тэрмінам навучання 3-4 гады;

3) вышэйшая адукацыя на базе сярэднеспецыяльнай (універсітэт культуры, акадэмія музыкі, акадэмія мастацтва, вышэйшыя каледжы, інстытуты) з тэрмінам навучання 3-4 гады;

4) спецыяльная пашыраная вышэйшая адукацыя (універсітэт культуры,акадэмія музыкі, акадэмія мастацтваў) з тэрмінам навучання 1-2 гады;

5) магістрат (тыя ж ВНУ) з тэрмінам навучання 1-2 гады;

6) аспірантура (універсітэт культуры) 3-4 гады;

7) дактарат (універсітэт культуры), працягласць навучання 2-3 гады.

Не адмаўляючы важнасці ўсіх ступеняў адукацыі і праблем, якія звязаны з імі, спынімся на 3 і 4 ступенях як патрабуючых на сённяшні дзень найбольшай увагі і неадкладнай рэарганізацыі. Мэта іх -- стварэнне магчымасцей і ўмоў для любога чалавека, які мае сярэднюю спецыяльную ці сярэднюю адукацыю, набыцця агульнагуманітарных, прафесійных і спецыяльных ведаў, атрыманне падрыхтоўкі ці перападрыхтоўка па накірунках і спецыяльнасцях, якія адпавядаюць яго здольнасцям, інтарэсам, патрэбам. Увядзенне гэтай сістэмы накіравана на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыяліста і даступнасці вышэйшай адукацыі, пашырэнне для грамадзян рэспублікі правоў на індывідуальны выбар характару і зместу адукацыі.

На першай ступені вышэйшай адукацыі (3) студэнт навучаецца 6-8 семестраў і атрымлівае па заканчэнні дыплом аб базавай вышэйшай адукацыі з пералікам дысцыплін і адзнак, у залежнасці ад якіх ён мае магчымасць працягваць адукацыю ці пачаць працу па адной з прыкладных прафесій у культуры.

У працэсе навучання на гэтай ступені пры выдатнай і добрай паспяховасці студэнт мае права прайсці дадатковую падрыхтоўку, напісаць бакалаўрскую работу і атрымаць ступень бакалаўра ў пэўнай галіне ведаў (па рашэнні атэстацыйнай камісіі з запісам у дыпломе: бакалаўр мастацтва, культуры, культуразнаўства, бакалаўр сацыяльнай педагогікі і г.д.).

Усе астатнія атрымліваюць сертыфікат аб вышэйшай адукацыі і пачынаюць працу ў адпаведнай галіне культуры.

Залічэнне на 4 ступень - спецыяльную пашыраную вышэйшую адукацыю - праводзіцца на конкурснай аснове і мае на мэце рэалізацыю адукацыйных і прафесійных праграм, накіраваных на пашырэнне гуманітарнага светапогляду; атрыманне асноў прафесійнай падрыхтоўкі па канкрэтнай галіне навукі ці культуры (сацыялогія, культуразнаўства, мас-

тантва, бібліятэказнаўства, мэнеджмэнт культуры, педагогіка, навуковая творчасць і інш.). На гэтым этапе за 1,5-2 гады студэнты вывучаюць, акрамя абавязковых, шэраг дадатковых дысцыплін на выбар ў залежнасці ад будучага месца працы. На гэтай ступені вывучаюцца ў асноўным цыклы вузкаспецыяльных дысцыплін, якія накіраваны на атрыманне канкрэтных спецыяльных ведаў у галіне культуры і яе трансляцыйных працэсах, фарміраванне навуковага светапогляду, нацыянальнага менталітэту, выпрацоўку прыемаў даследчыцкай дзейнасці, развіцце крэатыўнасці, здольнасцей да нестандартнай творчай дзейнасці ў галіне культуразнаўства, мастацтва і педагогікі. У праграме навучання абавязкова прадугледжваюцца практычная дзейнасць у адпаведнай адукацыі галіне культуры, напісанне і абарона магістэрскай работы ў канкрэтнай галіне ведаў. Пасля абароны кваліфікацыйнай работы выдаецца дыплом аб прысваенні вучонай ступені магістра навук. Дыплом магістра дае права не толькі на прафесійную дзейнасць на пасадах высокага рангу, але і на педагагічную дзейнасць у сярэднеспецыяльных і вышэйшых установах. Наяўнасць такога дыплома з'яўляецца ўмовай для навучання на 6, 7 ступенях: у аспірантуры і дактарантуры.

Смолік А.І., прарэктар
па навучальнай рабоце
Беларускага універсітэта культуры

## ПЕРАХОД ДА СУСВЕТНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ І СІСТЭМ ПАДРЫХТОЎКІ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ КАДРАЎ: ВЫНІКІ І ПРАБЛЕМЫ

Пераўтварэнні, якія праводзяцца цяпер у вышэйшай школе, прадугледжваюць павышэнне эфектыўнасці работы студэнтаў, увядзенне больш строгіх патрабаванняў да зместу навучання, стандартных вучэбных планаў, павелічэнне часу на выкананне вучэбных даручэнняў і іх аб'ёму для самастойнай працы. Разам з тым у гэтым працэсе параўнаўча мала ўвагі надаецца месцу выкладчыка ў навучальным працэсе. А універсітэту патрэбна высокая якасць выкладання, патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты.

Усе гэта прывяло да неабходнасці рэарганізацыі склаўшайся сістэмы вышэйшай адукацыі. У рэспубліцы пачаўся пераход да універсітэцкай адукацыі. На базе Мінскага інстытута культуры створаны адзіны ў рэспубліцы універсітэт культуры. Якім павінен быць гэты універсітэт?

Па-першае, гэта павінен быць буйны навукова-даследчы і вучэбны комплекс, у структуру якога ўвойдуць падраздзяленні рознага ўзроўню і статуса. На наш погляд, сярод кампанентаў гэтай структуры павінны быць інстытуты, навуковыя лабараторыі і навукова-даследчыя цэнтры.

Першыя крокі ў гэтым накірунку ўжо зроблены. Упершыню ў рэспубліцы ў Беларускім універсітэце культуры ствараюцца спецыялізаваныя саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Вучоныя змогуць абараняць навуковыя працы па тэорыі культуры, тэорыі і методыцы культурна-асветніцкай дзейнасці, бібліяграфіі і бібліятэказнаўству. Думаецца, у перспектыве можа існаваць савет па мастацтвазнаўству. Завяршаецца падрыхтоўчая работа па адкрыццю навукова-даследчай лабараторыі сістэм ведаў у мастацтве. Мяркуем, што шэраг кафедраў універсітэта павінны мець навукова-даследчыя цэнтры і лабараторыі, якія ў будучым могуць перарасці ў інстытуты.

Але задача універсітэта не зводзіцца толькі да развіцця навукі і падрыхтоўкі навуковай змены. Універсітэт павінен таксама даваць навуковую адукацыю, садзейнічаць індывіду ў яго самастойным развіцці і выкарыстанні навуковых ведаў і метадаў даследавання. Дасягненне пастаўленай мэты магчыма пры ўмове ўкаранення ў навучальны працэс так званага дасканалага выкладання "excellency". Аналіз форм і метадаў навучання, якія ў асноўным выкарыстоўваюцца сёння ў Беларускім універсітэце культуры, паказвае, што тэхналогія навучання зводзіцца да ўдасканалення сістэмы перадачы інфармацыі. І мала ўвагі надаецца вынікам навучальнага працэсу, індывідуальным якасцям студэнта. Несумненна, што такая тэхналогія прыводзіць да зніжэння якасці выкладання, непрыстасаванасці выпускніка універсітэта да ўмоў рэальнага жыцця.

Асноўнай задачай кафедраў універсітэта з'яўляецца перавод інтэлектуальнага патэнцыялу выкладчыкаў універсітэта на новую тэхналогію навучання, выкарыстанне якой зменіць функцыі педагога і студэнта, пераменіць іх адносіны да